

ТУТЭЙШЫЯ

НЕЗАЛЕЖНАЕ ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ВЫДАНЬНЕ

№6 (22), чэрвень 2012

ГРАМАДЗТВА



Цена лопаты для депутата

29-го мая 2012 года в суде Слуцкого района рассматривалось исковое заявление депутатов Слуцкого районного Совета депутатов к пенсионерке Зинаиде Тимошек о компенсации морального вреда. Судья удовлетворила требования депутатов, но уменьшила сумму компенсации морального вреда в 8-10 раз.

29-го мая 2012 года большой зал судебных заседаний в суде Слуцкого района был переполнен. Послушать судебное разбирательство изъявили желание около 70 человек.

История судебного процесса.

1-го октября 2011 года в Слуцке по инициативе гражданской активистки Зинаиды Тимошек на заросшем кладбище в центре города проводился субботник. На него были приглашены 25 депутатов районного Совета, которые получили индивидуальные приглашения за месяц до субботника. На субботнике присутствовали жители других городов, обеспокоенные диким состоянием кладбищ в Беларуси и бездействием местных органов власти (согласно Закону о содержании кладбищ деньги на содержание кладбищ выделяются из местных бюджетов).

Депутаты на субботник не явились, но люди, приехавшие из других городов, установили на аллее кладбища лопаты с табличками: «лопата для депутата» с ФИО депутатов. Внешне эти лопаты с длинными поперечными перекладинами для поддержки таблиц показались похожими на кресты.

Позже 23 депутата написали заявления в Слуцкий РОВД, был составлен административный протокол. 25-го ноября 2011 года состоялся административный суд. Согласно судебному постановлению, Тимошек Зинаида была наказана штрафом в 700 000 рублей за оскорбление.

В настоящее время Зинаида Тимошек по-прежнему не признаёт себя виновной в случившемся и продолжает оспаривать судебное постановление в порядке надзора (надзорная жалоба с просьбой отменить постановление суда направлена в Верховный Суд).

Судья оценила моральные страдания депутатов в 700 000 рублей каждому.

Четверо депутатов (Ражанец В. А., Казейко В. А., Ралько В. В., Макаров С. А.) настаивали на удовлетворении своих исковых требований в полном объёме. Сумму моральных страданий трое депутатов оценили в 5 миллионов белорусских рублей каждый, а депутат Макаров С. А. потребовал 7 миллионов белорусских рублей.

Принято считать, что моральные страдания нужно обосновывать и доказывать. Никаких документальных и прочих устных и письменных доказательств со стороны истцов не было предъявлено.

В свою очередь пятеро свидетелей событий показали, что Зинаида Тимошек виновата лишь в том, что пригласила всех на субботник, добросовестно на нём трудилась и не имела никакого отношения к установкам лопат для депутатов. Выступил в качестве свидетеля в суде и Валерий Щукин, который признал, что установил лопаты и собственноручно прикрепил таблички.

Зинаида Тимошек не признала исковое заявление и заявила, что она не подписывала никаких документов, которые бы её обязали нести ответственность за правопорядок на субботнике:

- Я не являюсь руководителем какой-либо организации подчинённых мне людей. Я пригласила всех поучаствовать в богоугодном деле. Кто с чем пришёл - это дело каждого человека. Я вела переписку с органами власти накануне субботника и просила председателя районного Совета депутатов Виктора Ражанца, потерпевшего, помочь в обеспечении порядка на субботнике в связи с тем, что я лишь проявила инициативу поработать. Он этого не сделал. К тому же на самом кладбище в момент инцидента находились сотрудники Слуцкого РОВД, обязанность обеспечить порядок - это их обязанность. Полагаю, что в этот день сотрудники РОВД действовали непрофессионально, а через 1,5 месяца милиционер Гаврилович дал лживые показания против меня. Считаю, что это дело специально направлено против меня, чтобы прекратить мою гражданскую активность.

Однако никакие доводы и доказательства Зинаиды Тимошек и адвоката Натальи Мацкевич в пользу её невиновности судью не убедили.

Судья Светлана Пастухова вынесла свой вердикт в пользу депутатов. Зинаида Тимошек должна оплатить моральные страдания на сумму в 700 тысяч каждому из четырёх депутатов, а также оплатить расходы на оплату госпошлины по 105 тысяч рублей каждому.

Правозащитник Павел Левинов присутствовал в суде:

- Судебное дело против Тимошек имеет явно политический контекст. Заинтересованность суда в исходе данного процесса просматривается с первых минут судебного заседания. Суд в нарушение статьи 78 Гражданского кодекса не позволил мне изложить мнение общественности по данному делу - не допустил представителя Белорусского Хельсинкского комитета к участию в процессе. Судья неоднократно отвечала сама за истцов и формулировала «правильные» ответы для протокола. На чём основано решение суда - непонятно. Ни один истец не смог предоставить доказательств причинения морального вреда. Полагаю, что данное решение имеет все основания быть отменённым областным судом.

Вместе с тем исковые требования истцов были удовлетворены не в полном объёме, так как сумма их требований была уменьшена в 8-10 раз. Депутаты, выходившие из зала суда, выглядели недовольными.

Марыя Верас, паводле http://regionby.org



Песні падземных жыхароў. Хроніка беларускага андэграўнду

Пра «чорны спіс» 2.0 усе даведаліся пасля прэзідэнцкіх выбараў-2010 (Першая хваля забаронаў пракацілася пасля выбараў-2006).

Тэхналогія беларускага культурнага «чорнага спісу» стандартная – канцэрты адмяняюцца невядома кім пасля наведвання канцэртных пляцовак «людзьмі са спецслужбаў».

Дакументаў, загадаў, подпісаў пад такімі распараджэннямі часцей за ўсё няма: клубныя дырэктары ў паніцы, музыкі здзіўленыя, а фанаты гуртоў здаюць квіткі.

Вінаваціць нібыта і няма каго, але ўсе разумеюць чаму адбываецца так.

«Свабодны Тэатр»

Кіраўніцтва тэатра пасля рэпрэсій прэзідэнцкай кампаніі-2010, пад пагрозай крымінальнага пераследу, выехала ў Лондан. Трупа рэпетуе і ладзіць закрытыя паказы спектакляў у невялікім прыватным дамку на ўскраіне Мінска. Прагоны спектакляў акторы праводзяць па Skype-канферэнцыі з рэжысёрамі тэатра.

Зміцер Вайцюшкевіч (музыка)

Сябе Вайцюшкевіч аднёс да ветэранаў «чорнага спісу» – у яго ён трапляе ўжо другі раз. З-за бардаўскага характару сваёй творчасці Вайцюшкевічу ўдавалася ладзіць падпольныя кватэрнікі, «офіснікі» і «сядзібнікі» цягам усяго года. Актыўна спявак дае канцэрты для прадстаўнікоў беларускай дыяспары ў Польшчы і Расеі.

Аляксандар Кулінковіч (гурт «Нейра Дзюбель»)

За апошні год Аляксандр Кулінковіч атрымаў болей адмоваў на канцэрты свайго гурту, чым гэтых канцэртаў адбылося. Хаця сам і ўдакладняе, што некаторыя канцэрты праходзілі нават у райцэнтрах, але без афіш і рэкламы.

Алесь Марачкін (мастак)

Прэзэнтацыю сваёй апошняй працы «Два генералы, пуга і сабака» мастак ладзіў у напаўзакрытым рэжыме. На карціне - недвухсэнсоўная пародыя на асоб, якія любяць узначальваць вайсковыя парады. Большасць сваіх карцін Марачкін паказвае шматлікім наведнікам сваёй майстэрні.

Ігар Варашкевіч (гурт «Крама»)

Апошні вялікі электрычны выступ гурту адбыўся на «гаротнай» Рок-Каранацыі-2011. Сам музыка, відаць, больш за ўсіх пацярпеў ад «чорнага спісу». Цяпер Варашкевіч працуе ледзь не ў стол і напрыканцы тыдня грае ў некалькіх кавярнях Мінска сусветную рок-класіку. Плацяць 30 даляраў за выступ.

Анастасія Шпакоўская (гурт «NAKA»)

Гурт «NAKA» найверагодней залічылі ў Black List за некалькі вострасацыяльных песняў - «Усіх забралі» і «За секунду да выбуху». У арганізацыі выступаў узнікаюць дзіўныя перашкоды, але некалькі канцэртаў сёлета Шпакоўская змагла адыграць. З малавядомай творчай спадчыны Анастасіі можна ўзгадаць яшчэ, што яна грае ў спетаклях у адным з мінскіх тэатраў.

Лявон Вольскі (гурт «Крамбамбуля»)

Скандал пачатку года – адмена канцэрта «Крамбамбулі» ў клубе Re:Public. Пакуль усе разводзілі рукамі, Вольскі ўласнаручна вяртаў грошы за квіткі адмененага канцэрту ў 20-градусны мароз. Такая маральная адказнасць перад публікай, сказаў пасля Вольскі. Адменены канцэрт усё ж адбыўся ў канцы красавіка ў Вільні. Разам з білетам на канцэрт слухач атрымаў бясплатную аднаразовую візу.


Сяргей Міхалок (гурт «Ляпіс Трубяцкой»)

Бронецягнік беларускага андэграўнду Сяргей Міхалок за апошні год стаў ледзь не нефармальным нацыянальным лідарам. Пры канцы 2011-га года беларуская пракуратура праводзіла праверку вострых выказванняў Міхалка пра Лукашэнку. У сувязі з гэтым, Міхалок не вяртаецца ў Беларусь больш за паўгода. Шматлікія фанаты «Ляпісаў» у Беларусі наведваюць канцэрты гурту за мяжой караванамі бас-тураў.

Паводле http://nn.by



Чаму маршрутчык *Ваван* такі злосны? Бо яго ніхто не цалуе! Акцыя: замаўляй маршрутку - цалуй *Вавана*!



ГУМАР

Жонка крычыць на мужыка, махаючы кулакамі:
- Будзеш яшчэ піць, будзеш яшчэ піць?!
- Угаварыла. Налівай!

***

Сатаніст Андрэйка пасля канцэрту Саладухі першы раз у жыцці перахрысціўся.

***

- Доктар! Дапамажыце! Я вам грошай дам, толькі дапамажыце спачатку!
- Давайце спачатку грошы, а то дапаможаш людзям - ні людзей, ні грошай, ні ўдзячнасці! Ляжыць у грobe і робіць выгляд, што не пазнаў!

УВАГА!

Падпісацца на «Тутэйшыя» магчыма, даслаўшы sms-паведамленьне з вашай адрэсай на нумар: +375 29 690 34 74

Падпіска і дастаўка бясплатныя!

©ТУТЭЙШЫЯ
НЕЗАЛЕЖНАЕ ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ВЫДАНЬНЕ

ПОГЛЯДЫ АЎТАРАЎ АРТЫКУЛАЎ МОГУЦЬ НЕ СУПАДАЦЬ З ПАЗЫЦЫЯЙ РЭДАКЦЫІ

УСЕ АРТЫКУЛЫ ДРУКУЮЦЦА НА МОВЕ АЎТАРАЎ
УЖЫВАЮЦЦА: БЕЛАРУСКАЯ (ТАРАШКЕВІЦА), БЕЛАРУСКАЯ (НАРКАМАЎКА) ДЫ РАСЕЙСКАЯ МОВЫ

СЛУЦКІЯ

Заснавальнік і выдавец:
грамадзкая ініцыятыва «Тутэйшыя»
Нашы кантакты:
***e-mail:** slucak1116@gmail.com.;*
***адрэса для ліставаньня:** 223610 г.Слуцак, а/с 60*
Распаўсюджваецца бясплатна
Наклад: 299 асобнікаў